**Уладзімір КРАЎЦОЎ:**

# «Частку сродкаў саюзнага бюджэту варта накіраваць на рэалізацыю сумесных камунальных і сацыяльных праектаў»

**Такую прапанову выказаў старшыня Гродзенскага аблвыканкама падчас Форуму рэгіёнаў у Санкт-Пецярбургу.**

Кіраўнік гродзенскага рэгіёна адзначыў станоўчы вопыт супрацоўніцтва вобласці ў гэтай галіне з дзяржавамі Еўрасаюза — Польшчай і Літвой, дзе па адпаведных трансгранічных праграмах рэалізуецца больш за 60 праектаў на конкурснай аснове. Агульны кошт грантаў па іх складае 30 мільёнаў еўра. Такі эфектыўны і зразумелы інструмент супрацоўніцтва на рэгіянальным узроўні можна выкарыстаць і ў рамках праграм Саюзнай дзяржавы — напрыклад, накіраваць частку сродкаў саюзнага бюджэту на рэалізацыю інфраструктуры, камунальных і сацыяльных праектаў. Гэта можа даць значны патэнцыял для фарміравання адзінай культурнай і гуманітарнай прасторы народаў Беларусі і Расіі праз развіццё і пашырэнне міжрэгіянальных сувязяў.

Гродзенскі рэгіён пастаянна пашырае міжрэгіянальнае супрацоўніцтва. На сённяшні дзень доўгатэрміновыя дагаворы падпісаны з 24 рэгіёнамі Расійскай Федэрацыі. На долю расійскіх партнёраў даводзіцца 50 % тавараабароту вобласці. За 2018 год гэтая сума дасягнула каля двух мільярдаў долараў. Найбольш актыўнае супрацоўніцтва склалася з Калінінградскай, Маскоўскай абласцямі, Рэспублікай Комі. Паміж раёнамі і гарадамі Гродзенскай вобласці і РФ падпісана 37 пагадненняў.

Будаўніцтва АЭС у Астраўцы Гродзенскай вобласці — яшчэ адзін прыклад эфектыўнага міжрэгіянальнага супрацоўніцтва. Тут не толькі сумесна працуе больш за пяць тысяч беларускіх і расійскіх будаўнікоў, але і ўсталёўваюцца цесныя сувязі паміж гарадамі-пабрацімамі Астраўца — Сасновым борам (Ленінградская вобласць), Дзеснагорскам (Смаленская вобласць), Зарэчным (Свярдлоўская вобласць), Обнінскам (Калужская вобласць). Цяпер вядзецца падрыхтоўка да падпісання дарожнай карты доўгатэрміновага супрацоўніцтва карпарацыі «Расатам» і Гродзенскага аблвыканкама.

Уладзімір Краўцоў адзначыў унікальную магчымасць Саюзнай дзяржавы — раўнапраўе ў атрыманні ведаў у навучальных установах дзвюх дзяржаў.

Замацаваць адносіны дапамагае турызм. Штогод Гродзенскую вобласць наведвае каля 60 тысяч расійскіх турыстаў. Высокі інтарэс выклікаюць санаторыі рэгіёна. Таксама актыўна развіваецца пазнавальны, вытворчы, рэлігійны турызм. У ліку аб'ектаў, якія наведваюць расійскія турысты, — Мемарыяльны комплекс у Смаргоні, прысвечаны лініі супрацьстаяння ў Першую Сусветную вайну. Праект рэалізуецца ў рамках Саюзнай дзяржавы, першая чарга завершана ў 2014 годзе, калі адзначалася 100-годдзе пачатку вайны. Цяпер распрацаваны праект па другой, завяршальнай чарзе ў стварэнні мемарыяла. Ён праходзіць узгадненне ў органах Саюзнай дзяржавы, і гродзенскія ўлады спадзяюцца на хуткае рашэнне ў падтрымцы стварэння мемарыяльнай зоны.

> Гродзенскі рэгіён пастаянна пашырае міжрэгіянальнае супрацоўніцтва. На сённяшні дзень доўгатэрміновыя дагаворы падпісаны з 24 рэгіёнамі Расійскай Федэрацыі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

## СУВЯЗІ СТАНУЦЬ БОЛЬШ УЗАЕМАВЫГАДНЫМІ

**Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Цярэнцьеў на VI Форуме рэгіёнаў Расіі і Беларусі падпісаў пагадненні аб супрацоўніцтве з кіраўнікамі мясцовых органаў улады Карэліі і Пскоўшчыны.**



Фота БелТА.

У прыватнасці, пагадненне разам з кіраўніком «парламента» Віцебшчыны падпісаў старшыня Заканадаўчага сходу Рэспублікі Карэлія Элісан Шандаловіч.

На погляд эканамістаў, супрацоўніцтва асабліва цесна можа быць наладжана і развівацца ў сельскагаспадарчай галіне, машынабудаванні, лесаперапрацоўцы і не толькі.

Народныя выбраннікі таксама будуць абменьвацца вопытам у сферы мясцовага самакіравання, спрыяць узаемадзеянню ў розных кірунках дзейнасці: ад умацавання правапарадку да аховы прыроды.

Кіраўнікі органаў улады згодныя ў тым, што паглыбленне сувязяў на дэпутацкім узроўні спрыяе ўзмацненню інтэграцыі ў рамках Саюзнай дзяржавы.

Міжнароднае дэпутацкае супрацоўніцтва афіцыйна замацавана і з Пскоўскім абласным сходам дэпутатаў. Кіраўнік гэтага прадстаўнічага органа ўлады Аляксандр Котаў паставіў свой подпіс пад пагадненнем разам з Уладзімірам Цярэнцьевым.

Паводле слоў Уладзіміра Цярэнцьева, што датычыцца сувязяў прыгранічных органаў прадстаўнічай улады з гэтым суб'ектам Расіі, прыкладна трэць з 45 пагадненняў, якія падпісалі за апошнія пару гадоў, — з уладай Пскоўшчыны.

І вельмі плённа вядзецца супрацоўніцтва паміж установамі культуры і адукацыі, СМІ — на абласным і рэгіянальных узроўнях. Не першы год запар ажыццяўляюцца і агульныя праекты.

Што датычыцца эканамічных сувязяў, тут ёсць нагода для гонару: калі ў першым паўгоддзі ў Віцебшчыны невялікае зніжэнне гандлёвага абароту з расійскімі рэгіёнамі, з Пскоўскай вобласцю наадварот — павялічыўся да 111 %.

У выніку падпісаных пагадненняў адкрываюцца новыя магчымасці для паскарэння развіцця партнёрства. Галоўнае, як падкрэсліў старшыня Віцебскага аблсавета, каб людзі адчулі перамены ў лепшы бок. Тыя, каму выбаршчыкі даверылі дэпутацкія мандаты, у розных кірунках спрыяюць пашырэнню міждзяржаўных сувязяў дзеля ўнёску ў эканоміку і стабільнасці стасункаў з суседзямі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

У ТЭМУ

# НОВЫ ВЕКТАР ПРЫНЁМАННЯ

**На форуме рэгіёнаў у Санкт-Пецярбургу падпісаны пагадненні аб супрацоўніцтве паміж Гродзенскай і Варонежскай абласцямі.**



Фота БелТА.

Дагавор датычыцца шырокага дыяпазону дзейнасці — ад гандлёва-эканамічнага да сацыяльна-гуманітарнага. Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Краўцоў і губернатар Варонежскай вобласці Аляксандр Гусеў абмеркавалі будучыя крокі падчас двухбаковых перагавораў. Выяўлены агульныя сферы інтарэсаў у турызме, адукацыі, навуковай дзейнасці, інавацыйных тэхналогіях.

Напрыклад, пляцоўкай для рэалізацыі сумесных праектаў можа стаць тэхнапарк у Гродне. Першы будынак быў адкрыты летась, хутка з'явіцца яшчэ адзін. Рэзідэнты прыходзяць сюды са сваімі інавацыйнымі праектамі.

Паспяхова працуе ў Гродне і філіял рэспубліканскага Парка высокіх тэхналогій, які аб'ядноўвае каля двух дзясяткаў рэзідэнтаў і паўтары тысячы супрацоўнікаў. Сярод заказчыкаў — вядучыя сусветныя брэнды і вытворцы амаль з 90 краін. Ёсць і ўласныя праекты, якія арыентаваны ў тым ліку і на расійскі рынак.

Быў адзначаны патэнцыял у эканамічным кірунку, які пастаянна расце. Так, тавараабарот паміж Гродзенскай і Варонежскай абласцямі за мінулы год дасягнуў 33 мільёнаў долараў, тэмп росту склаў 232 %. Гродзенскі рэгіён адпраўляе ў расійскі сельскагаспадарчыя машыны, мэблю, малако, жмыхі, алей і іншыя тавары. Ёсць магчымасць пашырыць асартымент паставак. Каб гэтага дасягнуць, удзельнікі сустрэчы вырашылі стварыць рабочую групу, якая зоймецца вывучэннем рынкаў і пунктамі агульнага інтарэсу. З гэтай мэтай Уладзімір Краўцоў прапанаваў расійскаму рэгіёну прыняць удзел у міжнародным эканамічным бізнес-форуме «Еўрарэгіён «Нёман», які штогод праходзіць у Гродне і збірае некалькі сотняў удзельнікаў.

> Пляцоўкай для рэалізацыі сумесных праектаў можа стаць тэхнапарк у Гродне.

Яшчэ плануецца разгледзець магчымасць абмену вопытам у будаўніцтве анкадыспансераў. Абодва рэгіёны якраз пачынаюць ажыццяўляць гэтыя значныя праекты. У Гродне для анкацэнтра з пансіянатам і стацыянарам будзе рэканструявана гарадская бальніца, а таксама дабудаваны некалькі карпусоў. Частка сродкаў прадугледжана абласной і рэспубліканскай інвестпраграмамі.

Адным з перспектыўных кірункаў сумеснай дзейнасці можа стаць турызм. Гэтая сфера цікавіць расійскі рэгіён. І сапраўды, гродзенцам ёсць што прапанаваць: тут захаваліся сотні гістарычных помнікаў, ідзе рэканструкцыя вядомых замкаў, з'явілася немала аб'ектаў турыстычнай інфраструктуры, распрацаваны новыя турыстычныя маршруты. Цікавымі будуць і аб'екты сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. З чатырох беларускіх аб'ектаў тры знаходзяцца менавіта на Гродзеншчыне — гэта Белавежская пушча, Мірскі замак і геадэзічная дуга Струвэ.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# Дэпутаты Міншчыны адкрытыя да супрацоўніцтва

Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Мінскім абласным Саветам дэпутатаў і Заканадаўчым сходам Свярдлоўскай вобласці падпісана падчас VI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі ў Санкт-Пецярбургу. Дакумент прадугледжвае ўзмацненне супрацоўніцтва ў сферы нарматворчай і дэпутацкай дзейнасці. Гэта мае на мэце абмен тэкстамі нарматыўных прававых актаў, іх праектаў, аналітычнымі, метадычнымі і іншымі матэрыяламі, развіццё прамых кантактаў паміж дэпутатамі, пастаяннымі камітэтамі і камісіямі, правядзенне сумесных канферэнцый, семінараў, сустрэч.

Акрамя таго, старшыня абласнога Саветаў дэпутатаў Наталля Якубіцкая выступіла з прапановай у межах наступнага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі падпісаць міжпарламенцкае пагадненне з калегамі Рэспублікі Татарстан. Старшыня Дзяржаўнага Савета Фарыд Мухаметшын падтрымаў ініцыятыву і выказаў гатоўнасць да ўмацавання парламенцкіх сувязяў з беларускімі партнёрамі.

У межах работы секцыі з дакладам таксама выступіла **старшыня Жодзінскага гарадскога Савета дэпутатаў Наталля СУШКО.** Яна адзначыла, што горад фарміруе больш як 13 % аб'ёмаў прамысловай вытворчасці Міншчыны. Жодзіна адкрыты для расійскіх партнёраў і ўжо мае пяць дагавораў аб супрацоўніцтве. Для павышэння інвестыцыйнай прыцягальнасці два зямельныя ўчасткі, размешчаныя на тэрыторыі горада, увайшлі ў склад свабоднай эканамічнай зоны «Мінск».

— Мы гатовы выдзеліць гэтыя тэрыторыі расійскім кампаніям для стварэння буйных вытворчасцяў з даваннем падатковых ільгот, а таксама прапанаваць расійскім інвестарам свабодныя зямельныя ўчасткі для рэалізацыі сваіх праектаў, — падкрэсліла Наталля Сушко.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**